

ВЯЛІКДЗЕНЬ
У ТЭЛЕЭФІРЫ

5

КАЛІ БУДЗЕ
ПЛЮС 19

16



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

14 КРАСАВІКА 2023 г. ПЯТНІЦА № 71 (29951)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Ігар КАРПЕНКА, старшыня Цэнтрвыбаркама:**

*«Ніводная выбарчая кампанія ў Беларусі не праходзіла без спроб ціску звонку. Прэзідэнт, дарэчы, аб гэтым сказаў у сваім Пасланні беларускаму народу і парламенту: фактычна ў суверэннай Беларусі, у нашай найноўшай гісторыі мы не ведаем такіх выбараў, якія праходзілі б спакойна. Нас заўсёды спрабавалі ў перыяд выбарчых кампаній разгойдваць, прычым звонку. Таму, вядома, трэба ставіць пэўныя заслоны. Абноўленая Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі зараз праходзіць абмеркаванне. Я думаю, што пасля яе прыняцця Усебеларускім народным сходам будуць яшчэ канкрэтна прапанаваны пэўныя меры, якія дазволяць нам на юрыдычным, арганізацыйна-тэхнічным узроўнях гарантаваць электаральную бяспеку».*

# ЛУНАЕ НАД ГОРАДАМ ЗВОН...



Людміла ФІЛІПЧЫК — адна са званароў храма Святога Апостала Андрэя Першазваннага ў Мінскім мікрараёне Серабранка, звоніць не так даўно — толькі трэці год. Яна выпускніца мінскай школы званароў, якой кіруе вядомы ў Беларусі настаўнік Багдан Бярозкін.

— Я была звычайнай прыхаджанкай гэтага прыхода, але, калі чула бой са званіцы, стаяла як зачараваная: мелодыя званоў кранала струны маёй душы, — дзеліцца Людміла. — Я доўга ішла да гэтага выбару, але аднойчы перасіліла сябе і пераступіла парог званарскай школы, можна сказаць, наблізілася да сваёй запаветнай мэты.

Людміле падабаецца быць уладаркай званіцы і іграць не толькі на адным — на ўсіх шасці званах адразу. З якім натхненнем і ўрачыстасцю яна падымаецца на сваю званіцу, дакранаецца да нацягнутых вяровачак, нібыта да струн, прымушае звонавыя языкі выконваць тэмбральныя і танальныя партыі і сваімі галасамі злівацца ў гарманічным страі! На наступным — Чырвоным — тыдні на пляцоўцы храма пройдзе фестываль сталічных званароў, у якім наша гераіня таксама плануе ўдзельнічаць.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

**КОРАТКА**

- **Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ, якім назва дзяржаўнага свята зменена з «Дзень Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь — другая нядзеля мая» на «Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь — другая нядзеля мая».**
- Экспертная група распрацоўвае альтэрнатыўныя механізмы цэнавага рэгулявання ў Беларусі.
- **Міжнародны саюз трыятлона дапусціў беларускіх і расійскіх спартсменаў да спаборніцтваў.**

ISSN 1990 — 763X

Спажывец

## ЧЫСТКА ГАЛЬШТУКАЎ І РАМОНТ АЎТО

**Стандарты бытавых паслуг, якія дзейнічаюць у нашай краіне, прадугледжваюць, што і ў абласным цэнтры, і ў сталіцы, і ў самай аддаленай і маланаселенай вёсцы чалавек мае права атрымліваць асноўныя паслугі быту. Пра тое, наколькі дадзеная ідэя ажыццёўлена, распавялі прадстаўнікі МАРГ і кіраўніцтва сферы бытавога абслугоўвання насельніцтва.**

**СТАР. 3**



Класныя навіны

## ВЫПУСКНЫЯ І ЎСТУПНЫЯ ЭКЗАМЕНЫ — У НОВЫМ ФАРМАЦЕ

### Чым выпускніку пагражае парушэнне правілаў удзелу ў ЦЭ?

**Прыёмная кампанія 2023 года цяпер — у самым разгары. Пра гэта на прэс-канферэнцыі паведаміў журналістам начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей ПІШЧОЎ і растлумачыў, што больш як 800 абітурыентаў — пераможцаў алімпіяд, якія праводзілі рэгіянальныя ВНУ, было рэкамендавана да залічэння ў ВНУ. Пасля атрымання імі дакумента аб агульнай сярэдняй адукацыі яны будуць залічаны на тыя спецыяльнасці, якія абралі яшчэ ў канцы 2022 года.**

### Адзін экзамен — для мэтавікоў

«У актыўнай фазе знаходзіцца і работа па забеспячэнні прыёму на мэтавыя месцы. Гэта дадатковая траекторыя паступлення для матываваных абітурыентаў, якія ўжо сёння бачаць тыя спецыяльнасці або прафесіі, з якімі яны гатовыя звязаць сваё жыццё, і шукаюць наймальніка, да якога праз чатыры-пяць гадоў прыйдуць на работу. Такая траекторыя карыстаецца цікавасцю як з боку заказчыкаў кадраў, так і з боку моладзі, — падкрэсліў Сяргей Пішчоў. — Адметнасць сёлетняй прыёмнай кампаніі ў тым, што набор на мэтавыя месцы вынесены за тэрміны асноўнай прыёмнай кампаніі. Прыём дакументаў будзе ажыццяўляцца з 1 да 5 чэрвеня, унутраныя ўступныя іспыты пройдуць з 6 да 13 чэрвеня, а залічэнне абітурыентаў у лік студэнтаў будзе праводзіцца да 16 чэрвеня.

**СТАР. 4**

З першых вуснаў

# «ПАТЭНЦЫЯЛ СУПРАЦОЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ З ТАТАРСТАНАМ КАЛАСАЛЬНЫ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу з кіраўніком Рэспублікі Татарстан Рустамам Мініханавым, які ў гэтыя дні знаходзіцца з візітам у нашай краіне. У якасці кіраўніка Рэспублікі Татарстан Рустам Мініханаў наведвае Беларусь чацвёрты раз. Ён таксама правёў перагаворы з Прэм'ер-міністрам Раманам Галоўчанкам. У рамках візіту госці наведалі ААТ «Амкадор», УП «Адані», ЗАТ «БНБК» і ААТ «Мінскі завод грамадзянскай авіяцыі № 407».**

Летась тавараабарот паміж Татарстанам і Беларуссю склаў 1087,2 мільёна долараў. А ў студзені-лютым 2023 года аб'ём узаемнага гандлю таварамі склаў 165,7 мільёна долараў.

Прэзідэнт акцэнтаваў увагу, што ў Беларусі і Татарстана склаліся вельмі прадукцыйныя дзелавыя адносіны, а патэнцыял і перспектывы нашых сувязяў — каласальныя. Ён падкрэсліў, што ў ходзе нядаўняга візіту ў Татарстан беларускай дэлегацыі на чале з Прэм'ер-міністрам вызначаны канкрэтныя напрамкі супрацоўніцтва.

«Як вы ведаеце, каля 50 працэнтаў тавараабароту паміж Мінскам і Казанню забяспечваецца сёння за кошт нафтахіміі. Таму рост аб'ёмаў гандлю ў 2022 годзе на 5,2 працэнта (да 1 млрд долараў) — нядрэнны паказчык. Але ён у поўнай меры не адлюстроўвае нашыя магчымасці. Бо нафтахімія — гэта толькі адзін кірунак. Таму правільна зрабілі, што, выпрацоўваючы план супрацоўніцтва, вы не абмяжоўваліся толькі нафтахіміяй. Нам трэба што б там ні было пашыраць наменклатуру ўзаемных паставак. Упэўнены, у ходзе цяперашняга візіту вы наведаеце шэраг прадпрыемстваў. Калі ў вас будуць нейкія інтарэсы, мы абавязкова будзем у тым напрамку працаваць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, беларускі бок у супрацоўніцтве з Расіяй робіць вялікую стаўку на прамысловую сферу. Прэзідэнты Беларусі і Расіі ў чарговы раз удзялілі гэтай тэме асаблівую ўвагу падчас двухбаковых перагавораў і на пасяджэнні Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы на мінулым тыдні ў Маскве.

«Вынікі сумеснай работы мы ўжо бачым. Створанае 20 гадоў таму таварыства з абмежаванай адказнасцю «Гандлёва-вытворчая кампанія «МТЗ-Татарстан» сёння з'яўляецца своеасаблівым хабам па рэалізацыі прадукцыі многіх айчынных вытворцаў. Яшчэ прыклад — Мінскі маторны завод, які сумесна з вашым холдынгам стварае сучасныя газавыя рухавікі. Было б нядрэнна, калі б вы дапамаглі паскорыць іх сертыфікацыю і запуск у серыйную вытворчасць. Ведаю, што паміж беларускім Мінпрамам і КАМАЗам дасягнуты дамоўленасці аб паглыбленні кааперацыі па вытворчасці розных аўтакампанентаў, вузлоў, агрэгатаў і мікраэлектронікі. Трэба паскарацца. Час нас прымушае паскарацца», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Толькі ў 2021 годзе Беларусь і Расія імпартавалі аўтакампаненты для транспартнага машынабудавання на суму звыш 19 мільярдаў долараў. «Велізарныя магчымасці. Велізарныя грошы, якія, вядома, мы нікому не павінны аддаваць. І мы з вамі тут можам сыграць асноўную ролю», — сказаў Прэзідэнт.

Ён таксама расказаў, што ў рамках Саюзнай дзяржавы плануецца запусціць каля 15 праектаў у машынабудаванні, якія маюць інвестыцыйна-каапераціўны эфект. Пытанні іх фінансавання вырашаны. «Будзем разам вырабляць шырокую лінейку прадукцыі: мікрасхемы, кар'ерныя самазвалы, сельгасмашыны, іншую тэхніку. Мы проста абавязаны выйграць час», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар звярнуў увагу, што Казанскі авіяцыйны завод імя С. П. Гарбунова вярнуўся да масавай вытворчасці далёкамагістральнага пасажырскага самалёта Ту-214. Па яго словах, у Беларусі захаваліся неабходныя кампетэнцыі і вытворчыя магутнасці, і беларускі бок гатовы наладзіць выпуск шэрагу кампанентаў. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ўжо сёння ў Беларусі вырабляецца каля паўтысячы дэталяў для расійскіх самалётаў.

Кіраўнік дзяржавы заявіў, што вялікія магчымасці для супрацоўніцтва адкрывае сфера інфармацыйных тэхналогій і лічбавай эканомікі. «Нашы магчымасці вы ведаеце, і калі мы тут скааперуемся і разам з вамі, значыць атрымаем добры эфект на перспектыву», — сказаў ён.

Прэзідэнт таксама звярнуў увагу на высокі ўзровень цікавасці жыхароў Рэспублікі Татарстан да мерапрыемстваў у рамках Дзён культуры Рэспублікі Беларусь, якія адбыліся ў 2022 годзе, што, па яго словах, пацвярджае важнасць культурных абменаў, захавання традыцый нашых народаў і, вядома ж, агульнай гістарычнай памяці. «Мы з вялікім задавальненнем прымем Дні культуры Рэспублікі Татарстан у нашай краіне», — паабяцаў ён.

Беларускі лідар падзякаваў Рустаму Мініханаву за цёплы прыём і падтрымку беларускай каманды ў Казані падчас міжнародных «Гульняў дружбы» 2022 года. Ён запэўніў, што беларусы ў даўгу не застануцца. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што пералік кірункаў, па якіх могуць супрацоўнічаць Беларусь і Татарстан, не мае меж.

«Упэўнены, што ваш візіт пацягне за сабой вельмі сур'ёзныя зрухі і адзін мільярд долараў мы пакінем далёка ззаду, перасягнуўшы яго, тым больш магчымасці ў нас каласальныя. Зыходзячы з той прадукцыйнай работы, якую вы ўжо правялі ў Беларусі, магчыма, узніклі нейкія праблемы, пытанні, на якія трэба звярнуць увагу і прыняць рашэнне. Мы гатовыя да гэтага. Мы з вамі даўнія знаёмыя, і я гатовы выслухаць любыя праблемы, якія існуюць», — падсумаваў кіраўнік дзяржавы.

Рустам Мініханаў падзякаваў Прэзідэнту Беларусі за сустрэчу і гасціннасць. «Мы заўсёды з вялікай цікавасцю наведваем Мінск, мы бачым, як развіваецца краіна, нягледзячы на ўсе беспрэцэдэнтныя санкцыйныя ціскі Захаду, шмат пазітыўных змен адбываецца, і, вядома, гэта ўплывае на якасць жыцця людзей. Мы лічым, што гэта ваша вялізная заслуга і актыўная работа ўрада краіны», — сказаў ён.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**У тэму**

## МАГЧЫМАСЦІ ЗНАЧНА БОЛЬШЫЯ

У размове з журналістамі Рустам Мініханаў паведаміў, што ў Беларусь прыбыла вялікая дэлегацыя — прадстаўнікі больш як 20 кампаній, а таксама органаў улады. «Наш тавараабарот каля мільярда долараў. Лічба немалая, але патэнцыял значна большы. Новыя выклікі, якія сёння ўзнікаюць у свеце, пераарыентавалі шмат пастаўшчыкоў, шмат лагістычных схем. Многія пытанні датычацца аўтамабільнай галіны. Шчыра ўдзячны нашым партнёрам за дапамогу з кампанентамі для нашых аўтамабільных заводаў. Вельмі сур'ёзныя магчымасці Беларусі ў галіне паставак авіякампанентаў, ужо ідуць адпаведныя работы. Мы лічым, што мы маем добры кантакт у рэчышчы развіцця нафтахіміі. І тут таксама ёсць патэнцыял не толькі ва ўзаемных пастаўках, але і ў стварэнні сумесных вытворчасцяў. Вельмі цікавы праект па біятэхналогіях, глыбокай перапрацоўцы збожжа. Акрамя эканомікі, ёсць пытанні абмену студэнтамі, правядзенне Дня культуры Татарстана ў Беларусі, пытанні спорту і турызму. Усе гэтыя тэмы цікавыя як для нашай краіны, так і для партнёраў з Беларусі. Мы шчыра задаволеныя нашым візітам у Беларусь», — падзяліўся кіраўнік Рэспублікі Татарстан.

# Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Шамілем Тарпішчавым

Прэзідэнт Беларусі сустрэўся з кіраўніком Федэрацыі тэніса Расіі. «Даўно мы не бачыліся, цэлую вечнасць», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. У свой час Шаміль Тарпішчаў вучыў Аляксандра Лукашэнку гуляць у тэніс. «Гэта мой настаўнік па тэнісе», — згадаў Прэзідэнт. «Я раўняўся толькі на вас. Таму я вучань», — парыраваў Шаміль Тарпішчаў. Але Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што спецыяліст і Ельцына навучыў гуляць у тэніс, і яго заадно. «Я адзін час нядрэнна асвоіў тэніс. Але вельмі цяжкі від спорту, самы цяжкі, мне здаецца. Там і мазгі ў парадку павінны быць, і фізічна павінен... І самы траўматычны від. Але тэніс — гэта справа добрая, вельмі добрая», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён расказаў, што, даведаўшыся аб хуткай сустрэчы з Шамілем Тарпішчавым, вырашыў для сябе аднавіць заняткі тэнісам: «Я калі ў графіку паглядзеў, што мы з табой сустрэнемся, падумаў: трэба тэрмінова выйсці на корт і пачынаць гуляць у тэніс. Ужо так кідацца на мяч не буду, але паціху аднаўлюся».

«Няхай іншыя бегаюць», — пажартаваў кіраўнік Федэрацыі тэніса Расіі. Ён падарыў Прэзідэнту сваю кнігу «Стрэс нараджае чэмпіёнаў. Загадкі псіхалогіі», у якой расказвае аб характэрных, а часам і ўнікальных прыкладах таго, як псіхалагічны стан прымушае нават падрыхтаванага спартсмена здаваць выйграныя пазіцыі або, наадварот, паспяхова выйсці са, здавалася б, безнадзейнай сітуацыі. Шаміль Тарпішчаў расказаў, што зараз піша працяг, бо тыраж кнігі разышоўся адразу. Прэзідэнт адказаў, што знаёмы з кнігай і лічыць вельмі актуальнай, цікавай і важнай выбраную аўтарам тэму.

### «У тэнісе мы не правалімся»

У размове з журналістамі Шаміль Тарпішчаў расказаў, што з Аляксандрам Лукашэнкам яны даўнія сябры. І на сустрэчы абмяркоўвалі, перш за ўсё, справы тэніса, нашы і ў свеце. «Калі зараз узяць вынікі беларускіх і расійскіх тэнісістаў, то мы сумарна наймацнейшыя ў свеце сёння. Мы практычна выйгралі ўсё. І ў такі складаны час трэба было перагледзець каляндар, каб падтрымаць дзяцей ад 12 да 19 гадоў — наш найбліжэйшы рэзерв, каб яны не выпалі з арбіты. Мы аб'ядналіся ў сумесных спаборніцтвах і зборах. Цікавасць больш у тым, каб не страціць тую сістэму і методыку, якая ў нас склалася. У нас адны і тыя ж трэнеры, яшчэ з Савецкага Саюза адна і тая ж школа, адно і тое ж разуменне класічнага тэніса. І, адпаведна, метадычна мы можам супрацоўнічаць, што з'яўляецца простай, добрай і рэальнай справай», — адзначыў Шаміль Тарпішчаў. Ён расказаў, што шмат разоў гуляў у тэніс з Прэзідэнтам Беларусі. «Мы з ім сябруем даўно, і акрамя таго, што ён выбітны чалавек, ён яшчэ спецыяліст па ўсіх відах спорту, таму што сам зацікаўлены спартсмен. Нам лёгка размаўляць, таму што мы гаворым на адной мове. Таму ў нас ніякіх праблем няма. Я думаю, што ў тэнісе мы не правалімся. У нас зорачак шмат і па сістэме і метадалогіі ў такі складаны час, у нас справы дакладна не горшыя, а можа, і лепшыя, чым у іншых відах», — адзначыў прэзідэнт Федэрацыі тэніса Расіі.

Ён таксама расказаў, як вядзецца дыялог з міжнароднымі тэніснымі арганізацыямі. Сёння няма праблем з удзелам спартсменаў у турнірах ITF і WTA. Няма праблем і з дзіцяча-юнацкім тэнісам, бо ў свой час арганізацыя Tennis Europe вырашыла, што дзеці могуць гуляць усюды. «Праблемы ўзнікаюць толькі з Вялікабрытаніяй. Таму што ITF і WTA — выключна спартыўныя арганізацыі, якія не ўмешваюцца ў палітыку. А калі ўмешваецца ўлада, яна «наязджае» на спорт, а не садзейнічае спорту. Таму са спартыўнага пункту гледжання пытанне ў тэнісе выбудавана больш правільна, чым у іншых відах спорту. Што да Алімпійскіх гульняў, пасыл МАК быў зроблены. Але ён зроблены такім чынам, што многія рэчы павінны вырашаць федэрацыі па відах спорту. Гэта будзе к лету, не раней», — расказаў Шаміль Тарпішчаў.

У сваю чаргу, старшыня Беларускай тэніснай федэрацыі Сяргей Рутэнка заўважыў, што ў статутах прафесійных асацыяцый дакладна прапісана: у турнірах удзельнічаюць спартсмены без нацыянальнай прыкметы і выключна па рэйтынгу. Аднак сёлета, звярнуў ён увагу, арганізатары Уімблдона сталі прыкрывацца патрабаваннямі ўрада Вялікабрытаніі.

Як заўважыў Шаміль Тарпішчаў, нягледзячы на ўсе цяжкасці, беларускія і расійскія тэнісісты дастойна выступаюць на міжнародным узроўні. Ён расказаў, што падчас Кубка Федэрацыі ў 2017 годзе Аляксандр Лукашэнка паабяцаў паказаць спартсменку, якая ў будучыні выйграе турнір серыі Вялікага шлема: «І мы пайшлі на трэніроўку Арыны Сабаленкі. І Аляксандр Рыгоравіч паказаў на яе як на будучую пераможцу Вялікага шлема. Я пагадзіўся. І калі яна выйграла, я гэта ўспомніў».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Спецслужбы Германіі папярэдзілі аб высокай рызыцы тэрактаў у краіне

Нямецкія спецслужбы папярэдзілі аб высокай рызыцы тэрактаў у Германіі на фоне наплыву ісламістаў, якія прыязджаюць у краіну пад выглядам бежанцаў. Аб гэтым паведаміла выданне FOCUS online. Паводле даных Федэральнага ведамства па ахове канстытуцыі ФРГ, цяпер на тэрыторыі краіны знаходзяцца 1750 патэнцыяльных тэрарыстаў. Спецслужбы папярэджваюць, што гэтыя людзі ў любы момант могуць учыніць тэрарыстычны акт. Радыкалы перасякаюць нямецкую граніцу пад выглядам бежанцаў. Большасць з іх прыязджае з блізкаўсходніх і цэнтральнаазіяцкіх краін. Адзначаецца, што нямецкія спецслужбы сочаць за патэнцыяльнымі тэрарыстамі, якія могуць складаць пагрозу бяспецы краіны.

### Колькасць загінулых з-за цыклону «Фрэдзі» ў Малаві перавысіла тысячу чалавек

У Малаві працягваюць весці аднаўленчыя работы пасля стыхійнага бедства. Пра гэта са спасылкай на заяву прэзідэнта краіны Лазаруса Чаквера паведаміла ТАСС. Па словах Чаквера, цыклон аказаўся самым разбуральным для краіны за апошнія два дзясяткі гадоў. Колькасць ахвяр «Фрэдзі» складае ўжо звыш тысячы чалавек. Раней мясцовыя ўлады паведамлялі пра больш як 670 загінулых і амаль 540 зніклых без вестак у выніку цыклону. Разбуральны трапічны цыклон прыйшоў у Малаві ў ноч на 13 сакавіка. З-за ліўняў утварыліся апоўзні, якія сталі прычынай абвальвання жылых дамоў. Найбольшыя страты «Фрэдзі» нанёс паўднёвым раёнам Малаві. У зоне разбурэнняў аказалася і эканамічная сталіца — Блантайр, адзначае ТАСС. Цыклон пераадолеў шлях больш за 8 тысяч кіламетраў і рассеяўся да 14 сакавіка. Усяго «Фрэдзі», які сфарміраваўся ў Індыйскім акіяне, існаваў 38 дзён. Гэтае стыхійнае бедства па праве лічаць самым працяглым за ўвесь час назіранняў за цыклонамі ў дадзенай частцы планеты. Сярод краін, на якія аказаў уплыў цыклон, — таксама Маўрыкій, Мадагаскар і Мазамбік.

**Закрытое акционерное общество «Белорусско-Швейцарский банк «БСБ Банк»**
**www.bsb.by**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
за 31 марта 2023 года

Закрытое акционерное общество
«Белорусско-Швейцарский банк «БСБ Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 31 марта 2023 г. | 1 января 2023 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 140 114 | 80 244 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 4 332 | 3 725 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 214 837 | 265 660 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 204 262 | 220 816 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 75 748 | 98 390 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 35 014 | 35 423 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 979 | 1 409 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 35 | 35 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 46 612 | 46 741 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | 1 507 | 1 507 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 18 602 | 21 768 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | | 742 042 | 775 718 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | 40 | 30 |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 639 | 33 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 615 171 | 652 340 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 6 585 | 11 332 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 622 435 | 663 735 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 22 900 | 22 900 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 14 193 | 11 683 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 33 042 | 31 866 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 49 472 | 45 534 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 119 607 | 111 983 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 742 042 | 775 718 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**
за 31 марта 2023 года

Закрытое акционерное общество
«Белорусско-Швейцарский банк «БСБ Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 31 марта 2023 г. | 31 марта 2022 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 4 300 | 3 833 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 333 | 619 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 3 967 | 3 214 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 11 460 | 7 547 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 4 846 | 3 332 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 6 614 | 4 215 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 548 | 16 294 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 133 | (51) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 15 437 | 17 474 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (430) | (1 771) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 2 887 | 22 290 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 566 | 20 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 11 261 | 11 937 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 630 | 453 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 12 057 | 4 715 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 2 611 | 1 578 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 9 446 | 3 137 |

Председатель Правления Дубков С. В.

Главный бухгалтер Бельник А. Н.

Дата подписания: 11 апреля 2023 г.

УНП 807000069


# ЧЫСТКА ГАЛЬШТУКАЎ І РАМОНТ АЎТО

## Па новых стандартах

Стандарты бытавога абслугоўвання насельніцтва ў апошнія гады пастаянна ўдасканальваюцца. Так, у сакавіку была прынятая пастанова ўрада, якой прадугледжаны змяненні ў адным з галоўных нарматыўных актаў, што рэгулюе дзейнасць бытавога абслугоўвання. Змяненні адкарэкціравалі нормы для адпаведнасці дзеючым нарматыўна-прававым актам. У прыватнасці, пастановай была актуалізавана інфармацыя, якая павінна даводзіцца да спажыўцоў, распавёў **начальнік упраўлення сацыяльнай сферы і паслуг Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Алег ВАСІЛЕНКА.**

— У Беларусі існуе дзяржпраграма па бытавым абслугоўванні «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе», якая заклікана падтрымаць суб'екты, што аказваюць бытавыя паслугі, — адзначыў прадстаўнік МАРГ. — Яна разлічана на 2021—2025 гады і прадугледжвае дадатковае фінансаванне падпраграм «Набыццё транспартных сродкаў, запасных частак да іх, іх рамонт у мэтах развіцця выязнога абслугоўвання сельскай мясцовасці», а таксама «Набыццё абсталявання, запасных частак і рамонт такога абсталявання ў мэтах тэхнічнага перааснашчэння суб'ектаў, якія аказваюць бытавыя паслугі ў сельскай мясцовасці».

Распрацаваны таксама прафесійныя стандарты ў сферы бытавога абслугоўвання, накіраваныя на павышэнне якасці паслуг, для прафесій «лазеншчык» і «касметык». Яны вызначаюць адукацыю асоб, якія жадаюць займацца такой дзейнасцю, іх кваліфікацыю, веды і навыкі.

## Мабільныя «дамы быту»

Зразумела, што ў буйных гарадах з паслугамі быту праблем у насельніцтва не ўзнікае. А як ідуць справы ў глыбінцы? У нашай краіне 11 відаў бытавых паслуг павінны аказвацца ў сельскіх населеных пунктах. Гэта, у прыватнасці, рамонт швейных вырабаў, абутку, мэблі, бытавых машын і прыбораў, тэхнічнае абслугоўванне бытавой радыёэлектроннай апаратуры. Абавязковыя таксама паслугі пракату, цырульні і фотапаслугі, прыём заказаў у пральню, хімчыстку, выраб рытуальных рэчаў.

— Бытавыя паслугі на вёсцы аказвае каля 13 % ад агульнай колькасці суб'ектаў, зарэгістраваных у рэестры бытавых паслуг на тэрыторыі Беларусі, — расказаў Алег Васіленка. — Шырокі спектр паслуг аказваецца камбінатамі бытавога абслугоўвання і шматпрофільнымі арганізацыямі, — адзначыў спецыяліст. — Усяго ў сельскіх населеных пунктах працуе 102 такія арганізацыі. Таксама прадстаўлены прыватны сектар, які аказвае шырокі спектр паслуг.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вельмі часта ў сельскай мясцовасці бытавыя паслугі аказваюцца пры дапамозе выязнога абслугоўвання, сказаў начальнік упраўлення сацыяльнай сферы і паслуг МАРГ.

— Летась назіралася тэндэнцыя росту колькасці суб'ектаў гаспадарання без стацыянарнага аб'екта, то-бок павелічэнне выязнога абслугоўвання, — распавёў Алег Васіленка. — На 1 студзеня бягучага года выязным абслугоўваннем на вёсцы займалася каля 1050 суб'ектаў.



Перасоўныя «дамы быту» — аўтобусы, дзе ёсць «мабільная цырульня». Тут можна здаць у рамонт абутак і адзенне, бытавую тэхніку, аднесці ў чыстку дываны, коўдры і падушкі. Аўтобусы курсіруюць па вёсках згодна з раскладам, іх рух таксама вызначаецца колькасцю папярэдніх заявак. А цэны на рамонт любой складанасці ў перасоўных «дамах быту» даступныя: «расходнікі» майстры закупляюць оптам, і гэта зніжае кошт паслуг для спажыўца. Аўтобусы бытавога абслугоўвання заязджаюць у самыя маланаселеныя і аддаленыя вёскі.

І хоць цяпер назіраецца тэндэнцыя да зніжэння на вёсцы колькасці ІП і фізічных асоб, занятых у дадзенай сферы ў параўнанні з мінулым годам, у цэлым бытавымі паслугамі ахоплена 100 % сельскага насельніцтва, рэзюмавалі спецыялісты. У апошнія гады галіна дынамічна развівалася, у яе пастаянна прыходзілі людзі. Так, напрыклад, у 2022 годзе падлічылі, што ў Брэсцкай вобласці колькасць занятых аказаннем бытавых паслуг на вёсцы за пяць гадоў узрасла ўдвая.

## Чаго хоча спажывец?

Якія ж бытавыя паслугі ў найбольшай ступені карыстаюцца попытам у беларусаў? У сельскай мясцовасці запатрабаваныя цырульні, арэнда і пракат, вытворчасць і рамонт адзення, паслугі па мыцці, а таксама па рамонце абутку і вырабаў са скуры, адзначаюць у МАРГ. У гарадах найбольш патрэбныя людзям рамонт транспартных сродкаў і паслугі касметалогіі.

Дарэчы, менавіта сфера бытавых паслуг — адна з тых галін, дзе пастаянна ствараюцца новыя працоўныя месцы і куды штогод прыходзяць людзі, якія жадаюць працаваць і зарабляць. Так, у сталіцы толькі за мінулы год тут створана тысяча працоўных месцаў і з'явілася каля 320 новых аб'ектаў. Усяго ж у Мінску бытавым абслугоўваннем занята каля 39 тысяч чалавек.

— Інфраструктура бытавых паслуг прадстаўлена разгалінаванай сеткай арганізацый малога бізнесу. На пачатак года ў сталіцы бытавыя паслугі аказвалі 9929 суб'ектаў гаспадарання. Стацыянарная сетка налічвае 8138 аб'ектаў, а таксама 3551 суб'ект гаспадарання аказвае паслугі з выездам да заказчыка на месца, — паведаміла **начальнік аддзела развіцця гандлю і паслуг аб'яднання «Сталічны гандаль і паслугі» Анастасія МАКАРСКАЯ.**

**«У нашай краіне 11 відаў бытавых паслуг павінны аказвацца ў сельскіх населеных пунктах. Гэта, у прыватнасці, рамонт швейных вырабаў, абутку, мэблі, бытавых машын і прыбораў, тэхнічнае абслугоўванне бытавой радыёэлектроннай апаратуры. Абавязковыя таксама паслугі пракату, цырульні і фотапаслугі, прыём заказаў у пральню, хімчыстку, выраб рытуальных рэчаў».**

У мінчан, як і ў жыхароў абласных цэнтраў і іншых буйных гарадоў Беларусі, самымі запатрабаванымі па выніках мінулага года сталі рамонт і тэхабслугоўванне аўтатранспарту і салоны прыгажосці (цырульнікі, каларысты, касметолагі і г. д.).

— Гэта амаль 60 % ад усяго аб'ёму аказаных паслуг у Мінску, — падкрэсліла Анастасія Макарская. — Летась аб'ём бытавых паслуг па Мінску аказаны на суму 711,2 мільёна рублёў, а тэмп росту да ўзроўню мінулага года склаў 119,6 %.

## З улікам запатрабаванасці

Арыентуючыся на спажывецкі попыт, пашыраецца і прапанова. І хоць сталіца чакана лідзіруе па разнастайнасці адпаведных паслуг, абласныя цэнтры імкнуцца не адставаць. Так, напрыклад, Брэст стаў другім пасля Мінска па колькасці суб'ектаў, занятых у сферы аказання бытавых паслуг. А на Віцебшчыне сярод іншага насельніцтву сёлета прапануюцца нават чыстка гальштукаў і біязавіўка валасоў для мужчын. Ну а сталічныя прадпрыемствы па выніках мінулага года працягнулі развіццё і мадэрнізацыю. Напрыклад, лазневая гаспадарка «Гарадскія лазні «адкрыла два СПА-комплексы — у «Лазні № 8» па вуліцы Веры Харужай і ў ЛАК «Сухарава» па вуліцы Сухараўскай. Прафесіяналы бытавога абслугоўвання актыўна адкрываюць для сябе новыя мікрараёны, прычым прыходзяць туды ў ліку першых, часам апярэджваючы гандаль і іншыя сферы: вось і міні-комплекс бытавых паслуг ужо адкрыўся ў новым сталічным мікрараёне па вуліцы Рудабельскай.

— Нашы прадпрыемствы працягваюць падтрымліваць ветэранаў, фізічна аслабленых асоб, пенсіянераў і шматдзетныя сем'і, — падкрэсліла Анастасія Макарская. — Гэтым катэгорыям спажыўцоў даюцца зніжкі на асноўны пералік бытавых паслуг. Летась такой прапановай у сталіцы скарысталіся 204 тысячы чалавек.

Паколькі ў сферу бытавых паслуг пастаянна прыходзяць індывідуальныя прадпрымальнікі і фізічныя асобы (самазанятыя), начальнік упраўлення сацыяльнай сферы і паслуг МАРГ падкрэсліў, што ажыццяўленне дзейнасці па аказанні бытавых паслуг заўсёды павінна пачынацца з уключэння ў адпаведны рэестр. Адносна ж уключэння ў рэестр летась таксама памяняліся нарматыўныя акты, адзначыў Алег Васіленка. Дарэчы, рэестр бытавых паслуг карысны не толькі работнікам згаданай сферы, але і спажыўцам. У ім утрымліваюцца адрасы аб'ектаў, дзе можна атрымаць неабходную паслугу, а таксама інфармацыя аб юрыдычнай асобе або індывідуальным прадпрымальніку, які ажыццяўляе той ці іншы від бытавых паслуг. Гэтую інфармацыю можна атрымаць анлайн праз партал электронных паслуг gov.by. Размешчана яна і на сайце МАРГ.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# ВЫПУСКНЫЯ І ЎСТУПНЫЯ ЭКЗАМЕНЫ — У НОВЫМ ФАРМАЦЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Абітурыент, які пажадаў навучацца на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, здае толькі адзін унутраны вусны экзамен па першым профільным прадмеце. Цяпер праходзіць фарміраванне камісій па вучэбных прадметах. Таксама навацыяй з'яўляецца ўключэнне ў склад гэтых прадметных камісій школьных настаўнікаў. Акрамя таго, ужо сёння на сайце Міністэрства адукацыі можна знайсці пералік пытанняў, якія будуць прапаноўвацца абітурыентам па тых ці іншых вучэбных прадметах. Яны дазволяць крышку скарэкціраваць траекторыю падрыхтоўкі да ўступнага іспыту на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі. Да таго ж падчас правядзення экзамену будзе забяспечана відэа- і аўдыёфіксацыя».

## Змяншэнне нагрузкі

У маі ў краіне ўпершыню пройдзе цэнтралізаваны экзамен (ЦЭ) для адзінаццацікласнікаў. «Сістэма адукацыі да правядзення выніковай атэстацыі ў новым фармаце цалкам гатовая, — запэўнівае **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй, дашкольнай і спецыяльнай адукацыі — начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Ірына КАРЖОВА.** — Выпускнікоў прымуць 144 пункты правядзення ЦЭ, з іх 30 размяшчаюцца на базе ўстаноў вышэйшай адукацыі, 60 — на базе ўстаноў прафесійнай адукацыі і 54 пункты — на базе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі: гэта школы, гімназіі, ліцэі... Таксама вызначаны арганізацыйныя камісіі, якія будуць займацца непасрэдна правядзеннем ЦЭ».

Прадстаўнік Міністэрства адукацыі паясніла, якія перавагі мае новы фармат выпускной кампаніі: «На наш погляд, яны відавочныя. Па-першае, раней выпускнікам трэба было здаваць чатыры выпускныя экзамены ў школе і праз невялікі прамежак часу яны здавалі яшчэ як мінімум тры цэнтралізаваныя тэсціраванні. Цяпер ім неабходна будзе здаць два ЦЭ плюс адно цэнтралізаванае тэсціраванне пры ўмове паступлення ва ўстанову вышэйшай адукацыі. Другая перавага — уніфікацыя формаў правядзення выпускных экзаменаў і экзаменаў уступнай кампаніі. Раней пасля заканчэння школы трэба было напісаць пераказ па рускай або беларускай мове, кантрольную работу па матэматыцы і здаць вусны экзамен па гісторыі Беларусі і замежнай мове. А пры паступленні здаваліся тэсты. Розныя формы правядзення экзаменаў маюць на ўвазе розную падрыхтоўку, а гэта была дадатковая нагрузка на вучняў. Цяпер выпускнікі будуць здаваць экзамен, які залічваецца і для выніковай атэстацыі ў школе, і для паступлення ва ўстанову вышэйшай адукацыі. Акрамя таго, новыя падыходы да выніковай атэстацыі павышаюць адказнасць школьнага настаўніка за вынікі сваёй працы, ад гэтага паляпшаецца якасць ведаў выпускнікоў».

## Цэнтралізаваны падвоз

Па словах Ірыны Каржовай, агульныя прынцыпы правядзення цэнтралізаванага экзамену супадаюць з правядзеннем цэнтралізаванага тэсціравання, але ёсць у яго і свае адметнасці. «Адна з іх — спосаб дастаўкі школьнікаў у пункты правядзення ЦЭ. Адзінаццацікласнікаў будуць дастаўляць туды цэнтралізавана. Гэтым займаюцца ўстановы адукацыі, абавязковым будзе суправаджэнне педагагічнага работніка. Такім жа чынам будзе арганізавана і дастаўка навучэнцаў з пункта правядзення экзамену да школ, — расказала Ірына Каржова. — Падтрымліваючы сняданак у школе (гарачы чай, булачка або печыва) будзе захаваны. Таксама плануецца арганізаваць работу буфетаў непасрэдна ў самых пунктах правядзення ЦЭ. Міністэрства адукацыі настойвае на тым, каб дастаўка навучэнцаў у пункт іспыту была цэнтралізаванай незалежна ад таго, сельская гэта мясцовасць, дзе падвоз будзе ажыццяўляцца школьнымі аўтобусамі ў раённы цэнтр, або Мінск ці абласныя цэнтры, дзе можна пад'ехаць і на грамадскім транспарце або таксама заказаць аўтобус. Важна памятаць, што гаворка ідзе пра выпускны экзамен, і педагогі нясуць адказнасць за тое, каб усе яго здалі своечасова і своечасова атрымалі атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі. Інструкцыяй прадугледжана, што ў пункт правядзення ЦЭ ўдзельнікі прыбываюць за гадзіну да пачатку экзамену, каб у іх быў час спакойна вызначыцца, у якой аўдыторыі яны будуць пісаць экзамен (а размеркаванне ўдзельнікаў і арганізатараў у аўдыторыях адбываецца метадам лёсавання), падрыхтаваць усё неабходнае, пераканацца ў тым, што пры сабе няма забароненых рэчаў.

Разам з тым калі бацькі будуць катэгарычна настойваць, што хочуць самастойна ўласным транспартам даставіць сваё дзіця ў пункт ЦЭ і бяруць на сябе адказнасць, дадзенае пытанне трэба вырашаць у індывідуальным парадку з класным кіраўніком і кіраўніцтвам школы».

Другое адрозненне — навучэнцы не рэгіструюцца самастойна на ЦЭ, як тое адбываецца пры рэгістрацыі на цэнтралізаванае тэсціраванне. Выпускнікі пішуць заяву непасрэдна кіраўніку сваёй установы адукацыі, у ёй яны згадваюць прадмет, па якім будуць здаваць цэнтралізаваны экзамен, а таксама мову, на якой павінен быць прадстаўлены тэкст самога іспыту па прадмеце на выбар: беларуская ці руская. Сертыфікаты ЦЭ адзінаццацікласнікі таксама атрымаюць ва ўстановах адукацыі разам з атэстатам аб агульнай сярэдняй адукацыі на выпускных вечарах, якія запланаваны на 10 чэрвеня. Балы, выстаўленыя па 100-бальнай сістэме, будуць пераведзены ў 10-бальную шкалу. Шкалы пераводу зацверджаны пастановай Міністэрства адукацыі. З улікам выніку, атрыманага на цэнтралізаваным экзамене, будзе выстаўлена выніковая адзнака ў атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі. Яна разлічваецца як сярэдняя арыфметычная гадавой адзнакі па вучэбным прадмеце і адзнакі, атрыманай на цэнтралізаваным экзамене.

Сяргей Пішчоў удакладніў, што абітурыенты, якія паступаюць у чэрвені на мэтавую падрыхтоўку, падаюць у прыёмную камісію ўвесь пакет дакументаў акрамя атэстата аб агульнай сярэдняй адукацыі. Але каб быць залічанымі, яны павінны будуць прадставіць атэстат, які атрымаюць у школе на выпускным вечары, да 15 чэрвеня.

## Пашпарт — абавязковы дакумент

Як расказаў **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Юрый МІКСЮК,** гэтымі днямі праходзіць рэгістрацыя на цэнтралізаваны экзамен, якая прадоўжыцца да 20 красавіка. Працэдурай рэгістрацыі займаюцца школы і пункты правядзення ЦЭ, за якімі школы замацаваныя.

— Рэгістрацыя ідзе даволі актыўна. Я ўпэўнены, што ўсё пройдзе своечасова. Навучэнцы павінны былі да 1 сакавіка ў сваіх школах вызначыцца з прадметамі ЦЭ. Часу ў іх для прыняцця рашэння было дастаткова, але бываюць выключныя выпадкі, калі нехта больш уважліва вывучыў сваю будучую спецыяльнасць і ўзнікла вострая неабходнасць памяняць прадмет. Зрабіць тое можна, звярнуўшыся да кіраўніцтва школы. Прычым зрабіць гэта трэба тэрмінова, бо да завяршэння рэгістрацыі часу засталося няшмат, — праінфармаваў дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў.

Юрый Міксюк падкрэсліў, што пры правядзенні цэнтралізаванага экзамену будуць прад'яўляцца сур'ёзныя патрабаванні да ідэнтыфікацыі асобы яго ўдзельнікаў. На ЦЭ, як і на ЦТ, будзе арганізаваны прапускны рэжым. Навучэнцы павінны будуць мець з сабой афармленыя пропускі, а таксама дакумент, які сведчыць іх асобу. Як паказала рэпетыцыя ЦЭ, частка навучэнцаў не мела пры сабе пашпартоў. Між іншым, яны абавязаныя на ўваходзе ў пункт правядзення ЦЭ прадставіць або пашпарт, або ID-карткі, або спецыяльную даведку з органаў МУС з фатаграфіяй і пячаткай у выпадку страты пашпарта. Гэта тыя дакументы, якія дазваляюць вызначыць асобу ўдзельніка выпрабавання. Калі пропуск навучэнцам будзе страчаны, то яго можна будзе выпісаць у самім пункце пропуску, такая магчымасць ёсць. Але без пашпарта ўдзельнік да экзамену не можа быць дапушчаны.

## Аднолькавыя ўмовы для ўсіх

Кіраўнік Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў праінфармаваў, што будуць сфарміраваны графікі дастаўкі навучэнцаў у пункты правядзення ЦЭ, каб не дапусціць іх масавага збору ў адзін момант і ў адным месцы. Патокі ўдзельнікаў экзамену павінны размяркоўвацца раўнамерна. Такі ўрок быў вынесены пасля правядзення рэпетыцыі ЦЭ ў студзені.

Акрамя таго, сур'ёзная ўвага пры правядзенні выпрабаванняў будзе аддавацца захаванню інфармацыйнай бяспекі: і на этапе распрацоўкі заданняў, і на этапе дастаўкі тэстаў, і на этапе суправаджэння экзаменацыйных матэрыялаў. «Ёсць добра адпрацаваная тэхналогія правядзення цэнтралізаванага тэсціравання, таму тут навацый няма. Арганізатары ў аўдыторыях павінны прытрымлівацца інструкцыі, якая дасць магчымасць стварыць аднолькавыя ўмовы для ўсіх навучэнцаў ва ўсіх аўдыторыях», — падкрэсліў Юрый Міксюк.

Гаворачы аб самім тэсце, дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў запэўніў, што яго структура і складанасць былі падабраны такім чынам, каб можна было ацаніць веды як моцных навучэнцаў, так і не вельмі добра падрыхтаваных: «Там ёсць заданні чатырох узроўняў складанасці. Заданні пятага ўзроўню складанасці, якія часта ацэньваюць як набліжаныя да алімпіядных, выкарыстоўвацца не будуць. Усе заданні знаходзяцца на ўзроўні базавай школы і не выходзяць за рамкі школьнай праграмы. Вынікі рэпетыцыйнага тэсціравання паказалі, што навучэнцы могуць падрыхтавацца да тэстаў самастойна або ў класе з настаўнікам і паказаць дастаткова паспяховыя вынікі. 115 навучэнцаў атрымалі на «рэпетыцыі» 100-бальныя вынікі. Яшчэ ёсць час, каб, не нервуючыся, паўтарыць матэрыял, добра адпачыць перад экзаменам і атрымаць самыя высокія балы на ЦЭ. Разам з тым, усім трэба ведаць, што парушальнікаў правілаў правядзення ЦЭ будуць выдаляць з аўдыторый і ўдзельнічаць у прыёмнай кампаніі ў ВНУ яны сёлета ўжо не змогуць. У аўдыторыі, дзе праходзіць цэнтралізаваны экзамен, нельга праносіць прадметы, за выключэннем дазволеных, нельга фальсіфікаваць даныя ў зоне рэгістрацыі бланка адказаў, нельга мяняцца месцамі, экзаменацыйнымі матэрыяламі, выкарыстоўваць чужую дапамогу, уносіць інфармацыю ў бланк адказаў пасля заканчэння адведзенага часу. Акрамя таго, нельга мець пры сабе сродкі сувязі, любыя носьбіты інфармацыі, пісьмовыя нататкі, нельга нічога выносіць з аўдыторыі, свабодна па ёй перамяшчацца».

**Юрый Міксюк параіў паставіцца да ўсіх патрабаванняў вельмі сур'ёзна. «Тыя, хто парушыць правілы правядзення экзамену, павінны быць гатовыя да таго, што будуць выдалены з аўдыторыі. І прайсці такое выпрабаванне яны змогуць толькі ў іншыя тэрміны — у жніўні. Такім чынам, яны страцяць магчымасць удзельнічаць ва ўступнай кампаніі ў ВНУ бягучага года», — дадаў дырэктар інстытута.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

**Лот:** изолированное помещение с инвентарным номером 121/D-3677 (наименование: квартира № 2; назначение: квартира), площадью 25,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Дрогичинский р-н, Дрогичинский с/с, д. Нагорье, ул. Железнодорожная, д. 71, кв. 2

| Начальная цена, руб. | 3 338,14 | Размер задатка, руб. | 333,81 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** РСУП «Брестплемпредприятие», г. Брест, ул. Карбышева, 35, тел. 80162530948. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** возможно предоставление рассрочки оплаты стоимости имущества в случае подачи заявления. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Шаг аукциона:** 10 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 05 мая 2023 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (https://au.nca.by/auction/14979), а также можно узнать по телефонам: 8 (0162)40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 04 мая 2023 г. до 17.00**

**ЗАО «БелБанкротАукцион»,**
организатор торгов по продаже имущества УП «Пинская СПМК-5» (УНП 200111234), объявляет о проведении **28.04.2023 г.** с 9.00 до 16.00 на электронной торговой площадке **bankrottorg.by** электронных торгов в форме аукциона

**Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2023/04/spisok-imushhestvapmk.pdf**

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296569865, Виктор.

Продавец: УП «Пинская СПМК-5».

